**Тэст «Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму»**

1. *Вызначыце слова, якім неабходна дапоўніць выказванне*: *Арфаэпічныя нормы рэгулююць правілы…*

1) напісання;
2) вымаўлення;
3) словаўжывання;
4) словаўтварэння;
5) словазмянення.

2. *Адзначце фанетычныя рысы, уласцівыя беларускай мове*:

1) гук [р] заўсёды цвёрды;

2) наяўнасць гука [ч’];

3) наяўнасць гука [ў];

4) гук [т] чаргуецца з гукам [ц’];

5) гук [в] чаргуецца з гукам [ф].

3. *Адзначце, у якіх словах вымаўленне і напісанне не супадаюць*:
1) лёгкі;
2) абход;
3) перагрупоўка;
4) судзейства;
5) лічба.

4. *Адзначце словы, у якіх літара* ***с*** *абазначае мяккі зычны* [с’]:
1) схема;
2) мужнасць;
3) след;
4) мазь;
5) скейтборд.

5. *Адзначце словы, у якіх ёсць гук* [г] *фрыкатыўны* (*працяглы*):
1) бег;
2) гімнастыка;
3) гантэлі;
4) гімн;
5) мазгі.

6. *Адзначце словы, у якіх адбываецца асіміляцыя* (*прыстасаванне зычных гукаў да суседніх зычных*):
1) дыск;
2) удзельнік;
3) прабежка;
4) пругкасць;
5) адхіленне.

7. *Адзначце словы, у якіх ёсць гук* [д]:
1) джыу-джыцу;
2) аджыманне;
3) падцягванне;
4) самаадчуванне;
5) падножка.

8. *Адзначце словы, у якіх ёсць гук* [дз’]:
1) барацьба;
2) хадзьба;
3) дзюдаіст;
4) адзнака;
5) падзенне.

9. *Запішыце, колькі разоў сустракаецца гук* [с] *у словазлучэнні* ***сысці з памоста***.

10. *Перакладзіце словы на беларускую мову і запішыце словы з прыстаўнымі гукамі*:
Обруч, оптика, опыт, организм, ось.

*11. Вызначыце слова, якім неабходна дапоўніць выказванне*: *Арфаграфічныя нормы рэгулююць правілы…*

1) напісання;

2) вымаўлення;

3) словаўжывання;

4) словаўтварэння.

*12. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара **а***:

1) тры…;
2) с...рдэчны;
3) ч...мпіянат;
4) Токі…;
5) р...гламент.

*13. Адзначце словы, напісаныя правільна*:

1) сэрвіс;
2) інтэрнет;
3) радэа;
4) райдэр;
5) Пітэр.

*14. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара **я***:

1) л…генда;
2) сямідз…сяты;
3) м…тровы;
4) дз…сятка;
5) г...раічны.

*15. Адзначце словы, напісаныя правільна*:

1) трыял;
2) функцыянальны;
3) авіяспорт;
4) легіанер;
5) дыапазон.

*16. Адзначце правільна напісаныя словы*:

1) кёрлінх;
2) скейдборд;
3) барацьба;
4) сёрфінг;
5) баскетбол.

*17. Адзначце правільна напісаныя словы*:

1) бодыбілдынг;
2) рафтынг;
3) мундзіяль;
4) акрабатыка;
5) пласціка.

*18. Адзначце няправільна напісаныя словы*:

1) скуцер;
2) спарціўны;
3) медыцына;
4) тэхніка;
5) сульфідын.

*19. Адзначце правільна напісаныя словы*:

1) абласны;
2) фарпостны;
3) карыстлівы;
4) шчаслівы;
5) Гольдшміт.

*20. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца* ***у***:

1) па...метра;
2) авіяшо...;
3) ваку...м;
4) рады...с;
5) бо...лінг.

*21. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца* ***ў***:

1) но...-ха...;
2) па...за;
3) паўднёва-...сходні;
4) Дэ Рі...;
5) сна...борд.

*22. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца* ***раздзяляльны мяккі знак***:

1) рэл...еф;
2) дас...е;
3) хадз...ба;
4) Н...ю-Ёрк;
5) ледз...ве.

*23. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца* ***апостраф***:

1) двукроп...е;
2) суб...ект;
3) здароў...е;
4) раз...езд;
5) павіл...ён.

*24. Адзначце дзеясловы, якія ў другой асобе множнага ліку загаднага ладу пішуцца з мяккім знакам*:

1) стан...це,
2) агледз...це,
3) правер...це,
4) адрэж...це,
5) вызнач...це;

*25. Адзначце, у якіх спалучэннях слоў трэба пісаць* ***вялікую літару***:

1) (Р,р)энтгенаўскі здымак;
2) (С,с)карынавы кнігі;
3) (С,с)карынаўская стыпендыя;
4) (А,а)лімпійскія гульні;
5) (Х,х)арламаўскі фінт.

*26. Адзначце выпадкі няправільнага выкарыстання* ***вялікай літары***:

1) Нацыянальны Сход Рэспублікі Беларусь;
2) Еўрапейскі саюз;
3) Кантынентальная Хакейная Ліга;
4) Дом адпачынку;
5) Палац спорту.

*27. Адзначце выпадкі правільнага выкарыстання* ***малой літары***:

1) папа Рымскі;
4) выступленне караля;

2) алімпійскі медаль;

3) курган Славы;

5) медаль «За працоўныя заслугі».

*28. Адзначце словы, якія пішуцца праз **злучок***:

1) 600 (мільённы);
2) (тры) шостыя;
3) (хто) небудзь;
4) (пяць) шэсць кіламетраў;
5) (пад) эгідай.

*29. Адзначце словы, якія пішуцца **разам***:

1) падача (з) верху;
2) (на) жаль;
3) ісці (на) лева;
4) трэніроўка (пасля) заўтра;
5) (с) пачатку гульні.

*30. Запішыце словы правільна*:

(А,а)лімпійская (Х,х)артыя, ід(эа,ыя,ыа)льны пракат, (грос)майст(э,а)р.